Цэна асобнаго нумэру 5 кап

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей„ хто ня захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакцыі. Рэдакцыя пакдае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. | 4 Верэсьня 1914 г. | № 35

### Ад рэдакцыі.

Рэдакцыя звертае увагу сваіх паважаных падпішчыкоў, што разьмер газэты зьменьшаны толькі пакуль што, с прычыны перэжыванаго усімі намі ваеннаго часу. Пры першай магчымасьці „Наша Ніва“ будзе друкавацца ізноў такой велічыні, як і раней друкавалася.

## Хай рунь красуе...

Шырокаю фаляй разлілося мора вайны па цэлым сьвеці. Перэжываем нешта такое чаго ніхто і ніколі як сьвет сьветам не перэжываў. З далёку і з блізку далетаюць да нас і добрые і благіе весткі аб вялікіх бітвах, аб змаганьнях мільёноў ваяк. Мімаволі родзіцца трывога перад заўтрашнім днём Слабые душою і целам апускаюць рукі, і, як вол доўбні, чэкаюць нечаго негаданаго, благога, наводзючы гэтым і на іншых сум ды трывогу. А трывога—гэта чэрвяк, які падточывае сілу і ахвоту да жыцьця, да працы на ніве і ў хаце.

Вось-жэ усе тые, што асталіся дома, што не маюць магчымасьці дзяліць долю і нядолю са сваімі роднымі на полі бітвы, павінны аткінуць ат сябе усякую слабасьць душы і цела, усякую непатрэбную трывогу, ды дружна ісьці да працы на сваіх загонах, да чаго клічэ ешчэ нас сьвятая павіннасьць працаваць і за тых, што аддаюць сваё жыцьцё дзесь там далёка ці блізка. Ня слухаймо благіх языкоў, што разсеваюць такіе ці сякіе плёткі, бо, як кажуць, у мор намруцца, а ў вайну налгуцца. Не спыняймо працы дома і за домам, якая ішла да вайны, і якая павінна далей ісьці. Цяперака час жытняй сяўбы. Дык жыва за плуг і севалку! Памагаймо тым, у каго німа каму выйсьці на поле с сяўняю. Кожны ведаць павінен сваё дзела: ваяка—вайну, а гаспадар—гаспадарку.

Што хто ні кажэ, а мы як мага засеваймо свае шнуры. Хай, як і летась, закрасуе і сёлета рунь. Вайна вечна трываць ня будзе; вернуцца нашы браты і сыны дамоў, можэ некаторые раненые, ня здольные да працы. Хай-жэ дома знойдуць усё ў парадку—неапушчэную хату, хлеб на стале.

Такім ладам мы споўнім сьвяты свой абавязак перад бацькоўшчынай і перад яе сынамі на вайне. І будзем сьмела тады глядзець сьвету у вочы са сьвятым пераконаньнем, што і мы, астаўшыеся дома, не спалі у шапку ў гэты час трывожны. Скончыцца вайна. С панад яе пажарнаго і крывавага дыму выгляне добрае, прыветлівае сонцэ і ажывіць сваімі праменямі нашы загоны і сенажаці. А цяпер - ведай кожны сваё дзела: ваяка—вайну, а гаспадар—гаспадарку. Засеваймо свае нівы—хай рунь красуе.

Я. К-а.

# ВАЙНА.

### Расейска-Аўстрыяцкая.

23 жніўня Заўзятые бітвы вяліся на ўсім аўстрыяцкім фронце. У ваколіцы Равы-Рускай крывавые бітвы з вялікімі аўстрыяцкімі сіламі

У цэнтры аўстрыякі атступаюць. Расейцы здабылі сільные украпленьня Мікалаева, якіе былі акружаны канавамі, патройным радам штучных, трудных для перахода, перашкод і мелі добра адгароджэные гарматы. Захоплено 40 арудзій і шмат запасоў. Аўстрыяцкая армія, напіраўшая ў Холмскім напрамку, атступае. Расейцы ўзялі шмат палонных, арудзіі і інш.; атакавалі сільна ўзмацаваную пазыцію каля Гарадка На левым беразе Віслы наша войска напіраець с карыснай перамогай.

23 і 24 жніўня расейцы заатакавалі Томашоўскую аўстрыяцкую армію с трох бакоў: ад Замосьця, ад Грубешова і ад Равы-Рускай. Аўстрыякі атступаюць у безпарадку. На Люблінскіх напрамках аўстро-нямецкае войска зьбіта з умацаваных пазыцій і адыходзе на поўдня. Вілікіе і заўзятые бітвы ідуць на фронце ад Равы-Рускай да Днестру, дзе разбітая аўстрыяцкая армія атрымала падмогу. Часьці 14 тырольскаго корпусу каля Равы-Рускай меціліся атакаваць расейцоў у ночы на 25 жніўня, але на другі дзень былі адбіты, пакінуўшы нам 500 палонных і знамя. Каля Замосьця расейцы узялі самалёт.

27 жніўня. Неспынянае ані на дзень змаганьне нашых войск з аўстрыякамі не дае магчымасьці падлічыць ваеннай здабычы. Гэтак, сотні палонных аддзельнымі парціямі (гуртамі) бяз ліку атпраўляюцца з усіх участкоў фронту на чугунку. Казацкі поўк прывёў с Фрамполя палонных 17 афіцэроў, 445 салдат, шмат коні і жывёлы. Захоплен яшчык з грашыма 144 тысяч. Іншы пяхотны поўк с стараны Замосьця узяў 700 палонных салдат з афіцэрамі.

27 жніўня згінуў с сваім самалётам вядомы расейскі лятун Нестеров, пагнаўшыся на сваей машыне і зніштожыўшы непрыяцельскі самалёт.

28 жніўня. Перамога, дасцігнутая расейцамі 27 жніўня ў бітвах с Красьнікской аўстро-нямецкай арміей, не спыняецца На фронце ад Томашова і Равы-Рускай да Днестра ідуць крывавые бітвы.

29 жніўня. Здабыўшы приступам умацованную пазыцію каля Ополе-Туробін, наша войска 28 жніўня напірало на непрыяцеля, пры чым некаторые часьці войска прайшлі з боем болей 30 вёрст. Пасьля заядлай бітвы ўзяты Томашоў. Заўзятые бітвы між Равой-Рускай і Днестрам не спыняюцца.

30 жніўня. Наша войска атрымало поўную пабеду над Красьнікскою і Томашоўскою аўстро-нямецкімі арміямі, атпёртымі за рэку Сан. Вялікая перамога дасцігнута такжэ над аўстрыякамі, змагаўшыміся ад заходней і паўночна-заходней стараны Львова. Намі ўзята у палон больш 200 афіцэроў і 30,000 салдатоў, шмат арудзіяў, пулеметоў і інш. ваеннай здабычы. Бітвы так і шлі: Сілы аўстрыякоў, прыймаўшые учасьце у гэтых бітвах, мелі каля мільёна чэкавек і 2500 гармат. Глаўная масса, каля 600 тысяч, расьцягнулася на фронце Завіхвосць—Томашоў для наступленьня на фронт Люблін—Холм. 12 жніўня, каб затуманіць нашы пабеды у Усходней Прусіі, аўстрыяцкіе арміі перайшлі ў безагляднае наступаньне. Расшырэньне нашых сіл на фронце у колькісот вёрст не было ешчэ закончэна. Першые атакі праціўніка былі скераваны на Красьнік, а пасьля найбольшые сілы сталі напіраць у раёне Томашова. 21 жніўня, к часу забраньня Львова, аўстрыяцкае наступаньне наймацней разьвілося. Наш плян быў такі, каб як найхутчэй узмацаваць сваё правае крыло, што было і выпоўнено нашымі чыгункамі. Ня гледзючы на малую лічбу нашаго цэнтру, наша войска ня толькі баранілося але і наступало ды с карысьцю змагалося каля Лашчэва, гдзе на працягу шасьці дзён адбівало безупынные атакі непрыяцеля, і толькі 20 жніўня па загаду атступіло. 22 жніўня мы перайшлі у агульнае наступленьне. Каля Сухадольля аўстрыяцкі цэнтр быў разьбіты і быстрым напорам нам удалося перэрваць зьвязь паміж Красьнікской і Томашоўскай групамі. Томашоўскую групу атакакаваў генерал Рузскій, контр атакі Красьнікской групы былі намі адбіты, і к 27 жніўню пазыціі непрыяцеля на фронце Ополе—Туробін, на працягу 60 вёрст былі ўзяты шыбкай атакай нашых войск. Аўстрыякі уцяклі, пакідаючы аружжэ. У гэтым часе аўстрякі кідаліся у атаку на наша левае крыло, каб перамагчы хоць на Львоўскім напрамку, але с 30 жніўня мы перайшлі і тут у прыступ Цяперака цягнуўшаяся 17 дзён галіцыйская бітва заканчываецца. Посьціг трывае.

1 верэсьня. Наша войска перэбіраецца церэз рэку Сан. На самай пазыціі каля Равы-Рускай узята 30 арудзій, больш 8000 палонных і іншай ваеннай здабычы. Армія генерала Брусілова так сама узяла шмат палонных, арудзій і інш., якое ешчэ падлічываецца. На правым беразе Днестру аўстрыякі атціснуты к Дорогобычу. Глаўны горад Буковіны, Чэрноўцы і ўся аколіца заняты намі бяз бою.

### Расейска-Нямецкая.

Перавезенае з захаду нямецкае войска зграмадзілося у Усходней Прусіі пры рэцэ Альле. 27 жніўня пачалося іх наступаньне, пры гэтым не малые атрады скераваліся цераз Мазурскіе вазёры. Расейскіе перэдавые часьці, стрымліваючы напіраньне праціўніка, адыходзілі па напрамку на ўсход.

28 жніўня немцы далей наступаюць. Глаўные сілы іх расшыраюцца у раёне Мазурскіх вазёр. Каля Мышынца ў Хожэлі наша войска атпёрла з вялікімі стратамі нямецкае войска.

31 жніўня. Агульнае палажэньне на Усходней Прусіі такое: С прычыны, што нашы сілы былі звернуты болей на Галіччыну, наша армія генерала фон Рэннэнкампфа у дваццатых чыслах жніўня затрымалася на лініі Гердауен—Лябіау. 25 жніўня пачаўся агульны рух немцоў як на ўсход проці генерала Рэнненкампфа, так і на паўдня, к нашай граніцы. 28 жніўня ясным стало, што немцы абышлі далёка наша левае крыло. Абход гэты змусіў нашу армію начаць атступленьне. 29 жніўня, каб затрымаць наступаньне праціўніка, мы перайшлі к дзелу, с чаго выявілося, што лічба наступаўшых немцой не малая. Бітвы на гэтым фронце адбываюцца.

1 верэсьня. С 15 па 25 жніўня немцы безупынна падвозілі падмогу сваім у Усходняй Прусіі. Узмацаваная такім парадкам армія нямецкая расьцягнулася з немалой сілай на фронце Нардэнбург—Гольдап—Сувалкі і мецілася загнаць у труднае палажэньне армію генерала Рэннэнкампфа. Але к 1 верэсьню, пасьля бітваў, якіе дорага абышлiся праціўніку, наша войска выведзена с труднаго палажэньня.

### Францyска-Англіцка-Нямецкая.

Хаўрусным арміям, францускай і англіцкай, у вайне з Нямеччынай с пачатку не шанцавала, асабліва, як немцы, разграміўшы Бэльгію, сталі наступаць на Францію. І хаўрусьнікі найболей атступалі, унікаючы генеральнай бітвы с праціўнікам. А немцы напіралі і апынуліся былі ўжо недалёка ад Парыжу. Цяперака шчасьце пераманілося: пачалася генеральная бітва па ўсіх фронтах, і ўжо хаўрусьнікі наступаюць, а немцы атступаюць. Арміі у паўтара мільёны са стараны француска-англіцкай і бадай ня меней са стараны нямецкай, адным словам 3 мільёны людзей вядуць паміж сабою крывавы бой на жыцьцё і сьмерць. Пачалася гэта бітва с 23 жніўня, а канца і ешчэ не відаць.

24—25 жніўня. Генеральная бітва развіваецца па лініі Нантэйль—дэ-Гоуэн—Мо—Сэзанн—Вітры да Вэрдэна. Левае крыло францускай арміі сустрэлося у добрых варунках с правым крылом нямецкаго войска. У центры францускіх войск і на правым крыле ў Лётарынгіі і Вогэзах ідуць бітвы. Каля Парыжу так сама ідзе бітва парыскаго гарнізону (крэпаснога войска) с правым крылом нямецкай арміі.

27 жніўня. Напор на праціўніка ідзе далей па ўсім фронце хаўрусных армій. Англічане біліся цэлы дзень, панёсшы троху страт. Немцы атступілі за Марну. Пятая французская армія захапіла шмат палонных. Шостая армія каля рэкі Урк вытрымала крывавую бітву. Немцы атціснуты. Пробы немцоў перайсці ў наступаньне адбіты па ўсей лініі. Хаўрусные арміі ва ўсіх напрамках пасунуліся наперад. 28 жніўня хаўрусная армія гвалтоўнай атакай атпёрла нямецкае правае крыло, якое перайшло было за Марну. 29 жніўня ва ўсіх напрамках ідуць далей крывавые бітвы. Хаўрусьнікі напіраюць, немцы атступаюць. Страты з абодзьвюх старон вялікіе. 30 жніўня на левым крыле пад напорам хаўрусных войск, агульнае атступаньне

немцоў не спыняецца. Так сама атступае цэнтр і правае крыло праціўніка. 31 жніўня так сама наступаньне хаўрусьнікоў не спыняецца.

За тыдзень гэтых безупынных бітвоў хаўрусные арміі узялі шмат палонных і ўселякай іншай ваеннай здабычы.

**Бэльгійска Нямецкая.**

Ня гледзючы на тое, што немцы Бэльгію звaевалі, а бэльгійскаго караля і ўрад змусілі зачыніцца у крэпасьці Антвэрпэн, вайна ешчэ з бэльгійцамі саўсім не сціхамірылася. Асталося ешчэ столькі бэльгійскаго войска, якое час ад часу добра даецца немцам у знакі, а дзе не хапаэ сілы—там бэльгійцы ваююць другім способом. Гэтак яны затапілі і далей затапляюць паўночную часьць сваей старонкі—даліну у ваколіцы Антвэрпэну і Маліну, і такім ладам не даюць немцам прыступу да крэпасьці. Кажуць, што ў гэтым патопе пагінуло шмат нямецкаго войска. С 28 жніўня ізноў пачаліся большые заўзятые бітвы з немцамі, дзе бэльгійцы атрымліваюць верх. Кажуць, што бытцым Нямеччына, каб развязаць сабе рукі у Бэльгіі, хацела з ёю замірыцца, але Бэльгія не згадзілася.

**Сэрбска-Аўстрыяцкая.**

23, 24 і 25 жніўня Сэрбы, наступаючы на аўстрыякоў, перайшлі аўстрыяцкую граніцу па напрамку к Вышэграду. Карысные бітвы для сэрбоў адбываюцца ўжо на непрыяцельскай землі. 28 жніўня пасьля крывай бітвы, сэрбы здабылі крэпасьць Землін Белград усё ешчэ аўстрыякі абстрэлiваюць. Шмат дамоў разрушэна.

**Чэрнагорска Аўстрыяцкая.**

27 жніўня. Чэрнагорскае войска пад камандою генерала Вукоціча пасьля крывай бітвы захапіло важные пазыцii на аўстрыяцкай зямлі на поўдня ад Сараева. Здабылі горад Фочу і наступаюць далей выпіраючы аўстрыякоў з ваколіцы між Фочай і Устрыпачэй у Босьніі. Атступаючы, аўстрыякі узарвалі мост на рэцэ Дрыне.

**Вайна на моры.**

Да 1 верэсьня англічане захапілі 225 тарговых караблёў, як ваенную здабычу. Паміж імі—13 англіцкіх, захопленых з непрыяцельскім грузам (таварам). Панаваньне на морах астаецца у руках Англіі і яе хаўрусьніц.

На Дунаю аўстрыякі параскідалі міны, і такім ладам плаваньне на рэцэ спынено. На Паўночным моры 26 жніўня наскочылі на міны і затанулі 3 англіцкіе караблі. Агулам на міны наскаківае шмат параходаў.

Нямецкіх караблёў на Паўночным моры англіцкая эскадра не нашла. Англіцкая эскадра стаіць каля Дарданелаў. Каля Швэціі выкрыта нямецкі флот у 30 ваенных караблёў, які плыў на ўсход

**Вайна у паветры.**

26 жніўня аўстрыяцкі самалёт кідаў на Белград бомбы, другі тое самае рабіў над Антівары. Французы падстрэлілі нямецкі самалёт, які пралетаў над Дюнкеркэм (у Франціі). Выкрылося, што гэты самалёт маніўся ляцець да англіцкіх берагоў сачыць праціўніка і кідаць бомбы.

---

**У Італіі** робюць перашкоды чужаземцам: Хто с чужаземцоў хочэ ўехаць у іх край павінен мець пашпарт пасьведчаны італьянскім консулам. Італьянская ваенная эскадра зграмаджываецца у Вэнэціі. На ўстрыяцка-італьянскай граніцы паявіліся сільные нямецкіе атрады.

**У Галяндзіі** гутараць аб тым, што і яна павінна умешацца у цяперашнюю вайну, каб не пайці с пустымі рукамі, як будуць іншые дзяліць дабычу.

**У Румыніі** па ўсіх чугунках гвалтоўна перавозіцца румынскае войска к граніцам Аўстрыі і Болгарыі. Спадзяюцца, што незабарам і Румынія зайграе на ваеннай дудцэ.

У **Турэччыне** урад скасаваў „капітуляцiі“, інaчэй—закон, заведзены здавен праз умовы з іншымі дзержавамі, па якому туркі ня мелі права судзіць чужых падданых, а судзілі іх свае урады. Да скасаваньня гэтаго закону дужа прычынілася Аўстрыя і Нямеччына, на перакор Расеі, Франціі і Англіі. Есьць магчымасьць, што гэтые апошніе дзержавы нездаволюцца с такога самавольства турак, і такім ладам будзе уцягнута у вайну і Турэччына, што вельмі на руку аўстрыякам і немцам. Цяперака Турэччына гвалтоўна збірае сваё войска Урад абвесьціў, хто скрыецца ад прызыву, таго будуць разстрэліваць, а дабро яго паліць.

У **Амэрыцэ** с прычыны вайны страшэнная безрабоцьце. У адным толькі Нью-Іорку 50 тысяч безработных.

У **Кітайшчыне** забароніў урад перавозіць па чугунках войска ваюючых дзержаваў. У некаторых пагранічных округах кітайскае войска стаіць ў баевой гатоўнасьці.

У **Афрыцэ**. Паведамляюць, што магамэтане у Эгіпце дужа спадзяюцца, што прыдуць туркі і вызваляць іх с пад хрысціянскаго панаваньня. 20 тысяч англіцкаго войска ужо туды зграмаджана, спадзяюцца ешчэ 10 тысяч. Ходзюць чуткі, што Турэччына зьбірае войска у Сырыі, каб напасьці на Эгіпет.

У цэнтральнай (сярэдней Афрыцы) адбываліся бойкі паміж нямецкім і англіцкім войскам с перэвагай на старане англічан.

---

## Каля вайны.

**Забітые і палонные.** Як падлічыў адзін англіцкі вучоны, то немцы у бітвах у Франціі і Бэльгіі пазбыліся 350 тысяч людзей, з атрыманых у Петроградзе вестак, страты французоў у бітве каля Шарлеруа аблічываюць у 120 тысяч людзей, забітых і раненых. Столькі-ж сама забітых і раненых мела і нямецкая армія. Такім парадкам у аднэй бітве французы і немцы пазбыліся с сваіх армій каля цьверці мільёна людзей.

Палонных найболей Расея узяла. Ешчэ да апошняй вялікай пабеды над Томашоўскай і Красьнікской арміямі аблічывалі узятых намі у палон аўстрыякоў на 82 тысячы. Ад пачатку вайны цераз Мінск перавезено у глыб Расеі палонных: аўстрыякоў — 209 афіцэроў і 11,620 салдатоў, немцоў—8 афіцэроў і 462 салдаты. 25 жніўня з Бродоў цераз Радзівілова атпраўлена у Кіеў каля 35 тысяч палонных аўстрыякоў. Па вылічэньню немцоў, то да 23 жніўня было ва ўсей Нямеччыне 15,682 узятых у палон французоў.

**Пісьмы палонных і к палонным.** Аўстрыяцкі урад абвесьціў, што пісьмы і пераводы па почце палонных, што знаходзюцца у Аўстрыі, і к ім, звальняюцца ад усіх пачтовых расходоў.

**Нямецкая падмога.** Немцы перацягіваюць сваё войска на ўсходні тэатр вайны. Цераз Бруксэлю пераехало 300 тысяч немцоў.

---

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**Аб пісьмах.** С прычыны установы у віленскай губ. ваеннай цэнзуры, главуны начальнік двінскаго ваеннаго вокругу звертаецца да ўсіх жыхароў з жаданьнем пісаць па сіле магчымасьці карэспадэнціі (пісьмы і тэлеграмы) на расейскай, францускай, польскай і нямецкай мовах. Гэта дзеле таго, каб аблягчыць працу ваенных цэнзороў і каб ня было астаноўкі у даставе карэспандэнціі.

**З мосту** на Нёмане скінуўся ў ваду і ўтапіўся падафіцэр запасу А. Швэйкоўскі, які быў прыстаўлены вартаваць гэты мост.

**За піва.** У Лідзе губэрнатар аштрафаваў гаспадара піўной П. Дварэцкаго на 1000 руб. або 3 месяцы арышту, а піўную закрыў.

## З Міншчыны.

Аб **сельска-гаспадарскім інстытуце у Мінску**. Недаўна прыежджаў у Мінск прэдстаўнік главунаго упраўленьня землядзельля і земляўстройства і выясьняў справу аткрыцьця у Мінску сельска-гасп. інстытуту (вышэйшай школы гаспадарскай). Выявілося, што Мінск за мала зямлі адвёў пад інстытут і тую ў нявыгадным мейсцы абмеркаваў. К таму, дужа ня зручны цяперака час займацца шчырэй гэтай хоць і важнай для нашаго краю справай. Вельмі магчыма, што першынство возьме Вітэбск, які шмат болей дае пад школу зямлі.

**Бальніца для раненых.** Гаспадар двара Блонь, Ігуменск. пав А. Бонч-Асмалоўскі, вядомы з нашумеўшай у сваім часе палітычнай справы, аддаў свой двор і хаты пад бальніцу для раненых.

**Помач семьям запасных.** Пінскае паветовае земство наладзіло атрад земскіх старастоў і дало ім земскіе малатарні для малацьбы збожа семьям запасных.

**Дакумэнты.** У Навагрудку сабраньне гарадзкіх упаўнамочэных адмовілося перэдаць на жаданьне папечыцеля учэбнаго вокругу у віленскую публічную біблiотэку 11 подлінных грамат XVI і XVIII веку, дадзеных гораду быўшымі літоўска-польскімі каралямі, і пастанавіло пакінуць гэтые акты на схову у гарадзкім абчэственным сабраньні.

**Пад суд.** Цягнуць пад суд урадніка з навагрудзкаго пав. А. Дзяўку за тое, што, арыштаваўшы нейкаго А. Гатоўчыца, так спрытна яго перакінуў цераз плот, што той узяў і памёр на мейсцы.

**Вайна с п'яньствам.** У Мінску вышаў загад да паліціі, каб арыштовываць кожнаго, хто паявіцца п'яным у людным мейсцы, ды цягнуць такога к адвету па закону ваеннаго часу.

За недазволеную продэж спіртных напіткоў засадзілі ў вастрог на 3 месяцы: аднаго жыхара з м—ка Семежава навагруд. пав., дваіх з м. Барановіч і дзьве шынкаркі у Пінску, а тракціры іх зачынілі на заўсёды.

У канцы верэсьня зачыняюцца манапольки: ў м. Амговічах, бабруйск. пав., ў с. Валасэвічах, барысаўск. пав. і ў с. Мілевічах, мазырск. пав.

Новадарогскі сельскі сход, бабруйск. пав., дамагаецца, каб закрыць у новадарогскай вол. 4 манапольки і ўсе піўные.

## С Ковеншчыны.

**Самалёты.** Над м. Дукштамі Ново-Александр. пав. часта перэлетаюць нямецкіе самалёты, асьвечываючы ваколіцы рэфлектарамі (асаблівымі ліхтарнямі).

**Дзяруць лыка...** У ваколіцы Купішак, вількамірск. пав. лазілі два вошусты у ваеннай форме і спісывалі дзеўчат, якіе бытцым маюць быць узяты на сёстры міласэрдзя да раненых. Якая дзяўчына не хацела гэтаго, с такой бралі колькідзесят рублёў выкупу. Дзяруць лыка, пакуль дзярэцца.

**Афішкі.** Каля Шаўляў і Мураўёва паявіліся нямецкіе праклямацыі на літоўскай і латышскай мовах, заклікаючые жыхароў стануць на старане немцоў.

---

# З усіх старон.

**Дармавы праезд.** Урадам пазволена з 28 жніўня да 31 сьнежня на дармавы праезд па казённых чугунках тым асобам, што былі высланы с Польшчы і Заходняго краю па прычыне вайны, і цяпер захочуць вярнуцца у свой край.

**Навука стрэляньня у школах.** Міністр асьветы загадаў, каб у сёлетнім школьным гаду, па сіле магчымасьці, вучылі у школах для хлапцоў ня толькі ваеннай муштроўкі, але і стрэляніны.

**На раненых.** М. Чэлноков аблічае расходы на лечэньне раненых па ўсей Расеі на 120 мільёноў рублёў. Савет міністроў пастанавіў выдаць наперад 3 мільёны рублёў ўсерасейскаму хаўрусу гарадоў і 3 мільёны хаўрусу земстваў на раненых. За месяц вайны маскоўскіе грамадзянскіе арганізацыі і маскоўскіе жыхары афяравалі на патрэбы вайны каля 11 мільёноў.

**Спраўкі аб забітых і раненых.** Вярхоўны Главнакамандуючы паведамляе Главуны Штаб, што ўсе весткі аб забітых і раненых на вайне пры першай магчымасьці будуць прыводзіцца у парадак і перэсылацца Главуному Штабу і мейсцовым установам для апавешчэньня заінтэрэсаваным у гэтым жыхарам. А пакульшто трэба с цярплiвасьцю чэкаць належачаго выясьненьня, бо безперарыўные паходы і бітвы, часта колькі дзённые, не даюць магчымасьці як належыць аблічаць хутка страты.

**Змаганьне с пьянствам.** Забарона прадажы піва прадоўжэна да 1 кастрычніка сёлетняго году. Ад 18 ліпняго да 19 жніўня, за першы месяц закрыцьця манаполек і шынкоў, вельмі зьменьшыліся праступкі і хуліганство па ўсей Расеі. Гэтак, у Кастромскай губ. бывала па 300 пратаколоў за хуліганства, а за «трэзвы» месяц толькі—18. У Ніжнім-Ноўгарадзе пратаколы аб пабоях і драках «па пьяному дзелу» зьменшыліся на тры цьверці, ня гледзючы на кірмашны (ярмарачны) час. У Саратаве з 250—300 пратаколоў сышло на 40. У Самары за месяц не затрымалі ні аднаго пьянаго. У Харкаве, Курску, Арле, Туле праступкі зьменшыліся на 75 працэнтоў. У Адэсі за буянство ніводнаго пратаколу не спісалі. У Екацерынбургу замест 280—300 пратаколаў спісалі за „трэзвы“ месяц толькі 2. Зьменьшылася такжэ лічба самагубстваў.

**Проці немцоў і аўстрыякоў.** Найвышэй забаронено ня толькі ваенным, але і чынам гражданскаго ведамства (цывільным) насіць нямецкіе і аўстрыяцкіе ордэны і інш. ад'знакі. Найвышэй загадано не даваць чыноў праз выслугу лет і не прэдстаўляць к Найвышэйшым наградам асоб—падданых тых гасударствоў, якіе вядуць вайну з Расеей, аж да канца гэтай вайны. Па загаду вышэйшаго ураду забіраюцца на казну (конфіскуюцца) коні, павозкі, моторные (машыновые) чоўны, самаходы і інш. прылады для пераезду, належачые да нямецкіх і аўстрыяцкіх подданых. Петроградзкі губэрнатар забараніў паліціі у тых мейсцох губэрніі, дзе шмат немцоў, гаварыць з імі па нямецку. Міністэрство дарог зьвертае увагу упраўленьне харкаўскай чугункі, што некаторые служачые дарогі дужа прыхільна і з надскаківаньнем адносюцца да нямецкіх і аўстрыяцкіх ваенна-палонных, якіе высылаецца адміністраціўна у глыб Расеі. Міністэрство прызнае, што такіе паступкі служачых у стасунку да немцоў і аустрыякоў не патрыотычны і не павінны мець на далей мейсца.

**Высылка.** Адміністраціўна высылаецца с Кіева у Табольскую губ., рэдактар „Украінской Хаты“ Богацкі.

**Забарона.** У Екацерынбурзе фабрычны інспектар не пазволіў бальнічнай касе рабочых-керамікоў вылічыць 500 р. у карысьць раненых.

---

Рэдактар-Выдавец

І. Луцэвіч.

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.